# Я ЎМЕЮ БЫЦЬ ДАРОСЛЫМ...

(Працяг. Пачатак на стар. 5).

У суботу матулю нечакана выклікалі на працу, і мне прыйшлося застацца з малодшым братам. “Хопіць спаць!” – пачаў я будзіць малога. Калі Сашка прачнуўся, я пачаў яго надзяваць. “Я хачу есці, хачу амлет!” – крычаў малы. Прыйшлося мне гатаваць снеданне. Потым мы заслалі ложкі і пачалі збірацца на вуліцу. “Туды не хадзі, сюды не лезь!” – штохвілінна маўляў я. А праз гадзіну вярнулася маці. “Як вы тут без мяне?” – папыталася яна. “Паелі, пагулялі, посуд вымылі”, – адрапартаваў я. Вось так я умею быць дарослым.

***Іван Паляшчук.***

Раней я не вельмі разумела, калі маленькаму дзіцяці казалі: “Ты ўжо зусім дарослы”. А дапамог мне гэта зразумець такі выпадак. Калі мне было 7 гадоў, упершыню прыйшлося застацца дома адной. Мама вельмі хвалявалася, як я спраўлюся, ці не застануся галоднай. Я супакоіла яе, сказала, што ўсё будзе добра, хаця сама крыху перажывала. Застаўшыся адна, я спачатку засумавала, потым узяла сябе ў рукі і вырашыла даказаць, што магу быць самастойнай. Я прыбрала кватэру, пакарміла ката, прыгатавала салат для мамы. Калі вечарам яна вярнулася, то была прыемна здзіўлена і сказала: “Я і не заўважыла, калі ты вырасла і стала дарослай”.

***Кацярына Аўтуховіч.***



# ШКОЛЬНАЙ СЦЯЖЫНКАЙ ДА ПОСПЕХУ

**- Макар, як ты арганізоўваеш вольны час, які выдараецца калі-нікалі?**

*- Гуляю ў камп’ютарныя гульні, гутару з сябрамі і роднымі ў сацыяльнай сетцы, займаюся пошукам патрэбнай інфармацыі. Вельмі люблю адпачываць з сям’ёй: у выхадныя мы разам ездзім у сталіцу, каб наведаць боўлінг, тэатр, цырк, заапарк, басейн. У бліжэйшы час плануем завітаць у дэльфінарый.*

**- Акрамя ўжо набытых перамог у тваёй скарбонцы, чаго б яшчэ хацелася дамагчыся?**

*- Усюды і ва ўсім імкнуся паспрабаваць свае сілы. Для мяне ўжо даўно сталі дэвізам такія словы: “Рухацца да пастаўленай мэты і дасягаць поспеху”.*

**Напрыканцы размовы я яшчэ раз павіншавала нашага героя, Макара Шпакоўскага, з перамогай і пажадала, каб школьная сцяжынка заўсёды вяла хлопца да вызначаных мэт, а атрыманыя на ёй веды, уменні і навыкі спрыялі ажыццяўленню творчых планаў.**

***У ГАСЦЯХ У ПСІХОЛАГА***

# НА ТЭМЫ МАРАЛІ

У мэтах прафілактыкі права-парушэнняў сярод непаўналетніх ва ўстановах адукацыі раёна праводзяцца мерапрыемствы з вучнямі падуліковых катэгорый, накіраваныя на прапаганду здаровага ладу жыцця і беражлівых адносін да сямейных каштоўнасцей.

У нашай школе 16 лютага сустрэліся падлеткі з трох школ горада і раёна для правядзення сумеснага вольнага часу. У рамках сустрэчы прайшло знаёмства са школай, яе гісторыяй, традыцыямі. Тэма занятку “Каштоўнасці ў жыцці чалавека і ў разуменні сучасных падлеткаў”, якое праводзілі педагогі-псіхолагі школы, А.С. Найда і А.В. Аўтуховіч, дазволіла вучням задумацца над тым, што галоўныя каштоўнасці ў іх жыцці: “сям’я”, “здароўе”, “жыццё”, “адукацыя”, “бацькі”, “шчырасць”, з’яўляюцца такімі ж важнымі і актуальнымі і для іх аднагодкаў, і для дарослых. У працэсе заняткаў навучэнцы праявілі актыўнасць: з цікавасцю выконвалі прапанаваныя ім заданні, адстойвалі свой пункт гледжання.

**Дарэчы, свае пытанні можна штодзённа ананімна задаць псіхолагу, даслаўшы іх на адрас электроннай пошты berezinosch2.edu@tut.by. Вы абавязкова атрымаеце адказ і не застанецеся сам-насам з цяжкасцямі. Памятайце, любая праблема мае вырашэнне!**

# Я ЎМЕЮ БЫЦЬ ДАРОСЛЫМ...

ПРОБА ПЯРА

***Дзіўна пабудаваны свет. У дзяцінстве нам усім хочацца як мага хутчэй стаць дарослымі і самастойнымі. Менавіта тады і здаецца, што час павольна цягнецца. Але, дасягнуўшы нарэшце дзіцячай мары і пасталеўшы, мы хоць на момант жадаем вярнуцца ў цудоўны, яркі, непаўторны, бесклапотны свет дзяцінства. Сёння пра дарослае жыццё і сталенне разважаюць вучні 5 "Б" класа нашай установы.***

З кожным годам я станаўлюся больш дарослай. Аднойчы мяне матуля папрасіла дапамагчы па гаспадарцы: памыць падлогу, вымыць посуд і вынесці смецце. Калі я ўсё гэта зрабіла, матуля адразу заўважыла. Потым мяне пахваліла сказаўшы: "Мая дачушка стала дарослай!"

***Паліна Наскавец.***

Калі я была яшчэ малой, то вельмі любіла фарбавацца матулінай касметыкай. Малявала губы памадай, вочы - ценямі і тушшу. Я рабіла сабе вельмі прыгожыя прычоскі і насіла матуліны туфлі на абцасах. Яна на мяне за гэта сварылася і казала, каб я болей нічога не брала без дазволу. У шэсць гадоў я навучылася мыць посуд. Матуля мяне хваліла і называла дарослай. Я ж, толькі калі пайшла ў школу вучыцца, адчула сябе па-сапраўднаму дарослай.

***Ганна Жукоўская.***

У дзяцінстве я вельмі хацела быць дарослай. Думала, што каб стаць дарослай, трэба хадзіць у школу, таму што мой старэйшы брат вучыўся ў школе, і мама гаварыла, што ён дарослы. Аднойчы, калі я прыйшла з дзіцячага садка, то палічыла да ста. Матуля на тое сказала, што я ўжо стала дарослай.

***Юлія Калянковіч.***

Калі я была маленькай, то вельмі хацела быць дарослай. Усё паспрабавала: і ў матуліных туфлях хадзіла, і пацеркі прымервала. Нічога не атрымлівалася. Толькі смяяліся з мяне. Адным разам я надумала падмесці падлогу і падмяла. Ды так чыста, што нават матуля здзівілася:

- Дачушка, ды няўжо ты ў нас дарослай становішся? А калі я чыста-начыста вымыла посуд ды суха-насуха выцерла яго, тада не толькі матуля, але і бабуля здзівілася:

- Мы і не заўважылі, што наша ўнучка стала дарослай.

***Ліза Казачонак.***

У дзяцінстве я вельмі хацела быць дарослай. Я надзявала матуліны туфлі і сукенкі. Потым падумалася: не, так я не стану дарослай. І я пачала дапамагаць матулі: прыбірала хату і мыла посуд. Матуля казала мне: "Дачушка, якая ты ў мяне дарослая".

І толькі цяпер я зразумела, што лепш быць маленькай, таму што дзяцінства бывае толькі адзін раз у нашым жыцці.

***Кацярына Сіняк.***

Некалькі разоў на тыдзень я застаюся адзін дома. Прыходжу са школы дамой і адчуваю сябе дарослым, бо некаторыя абавязкі я раблю без дапамогі дарослых. Магу разагрэць сабе ежу і схадзіць у краму, падмесці падлогу, памыць посуд. Калі прыязджаюць мае бацькі, яны вельмі рады маёй дапамозе па дому і лічаць мяне дарослым.

***Ягор Карповіч.***

Мне часта мама гаворыць: "Сынок, калі ты ў мяне ўжо станеш дарослым?" І вось аднойчы, калі мамы не было дома, я вырашыў "стаць дарослым". Але як гэта зрабіць, я не разумеў. І тады я пачаў успамінаць, што робіць матуля, калі прыходзіць з работы. Перш-наперш я вымыў посуд, прыбраўся ў сваім пакоі. Потым я самастойна зрабіў усе урокі. Калі мама прыйшла з работы, яна вельмі здзівілася і нават не зусім паверыла, што гэта ўсё я сам зрабіў. Але дома больш нікога не было. І яна сказала: "Нарэшце ты стаў дарослым!"

***Кірыл Рахманаў.***

# ...СВЕТЛАЯ, ЯК ТРАВЫ Ў РАСЕ. ВОБРАЗНАЯ, ВОЛЬНАЯ, ПЯВУЧАЯ, МОВА БЕЛАРУСКАЯ МАЯ!

**21 ЛЮТАГА** ўвесь свет адзначае Міжнародны дзень роднай мовы. Роднай — значыць любімай, дарагой, самай-самай... Беларусам многія могуць пазайздросціць: у спадчыну нам засталася па-сапраўднаму ўнікальная мова. Пяшчо-о-ота, мі-і-іласць, натхне-е-енне... Паводле даследаванняў ЮНЕСКА, беларуская мова з’яўляецца самай мілагучнай пасля італьянскай.

***Напярэдадні свята мовы члены клуба “Юны журналіст” шукаюць адказ на пытанне: “Чаму беларусы не размаўляюць на роднай мове?”***

**Яўгенія (8 «Б»):**

- Я размаўляю, але вельмі мала. Прызвычаілася да рускай мовы. Бывае, што ўжываю беларускія словы ў маўленні, акрамя ўрокаў беларускай мовы і літаратуры, але вельмі рэдка.

**Іван (5 «Б»):**

- Мне родная мова вельмі падабаецца, але ўзнікаюць цяжкасці пры маўленні, бо цалкам беларускай мовы пакуль не ведаю. Я задаволены тым, што ёсць у мяне прыклад для пераймання: тата размаўляе па-беларуску на працы, калі вядзе беларускамоўную праграму на радыё.

**Аліна (5 «Б»):**

- Я не размаўляю на беларускай мове, таму што адчуваю цяжкасці пры перакладзе слоў. Нягледзячы на гэта, буду імкнуцца да пераадолення цяжкасцей. Ёсць і пэўная прычына: вельмі падабаецца гучанне роднай мовы, напрыклад, такія словы як дзяўчынка, дзякуй.

**Ліза (5 «Б»):**

- Мне цяжка размаўляць па-беларуску, таму што часам не разумею сэнс некаторых слоў. Імкнуся навучыцца беларускай гаворцы з дапамогай матулі, якая дома часам размаўляе з намі на роднай мове. Мне вельмі падабаюцца гучаннем беларускія словы, тыпу вясёлка, матуля.

**Паліна (8 «Б»):**

- Таму што ў горадзе большасць размаўляе на рускай мове. Яна і для мяне больш зразумелая. Але бывае такое, што калі гавару па-руску, ужываю беларускае слова. Гэтаму ёсць тлумачэнне: так як мы беларусы па нацыянальнасці, то часта праскокваюць у гутарцы беларускія словы.







***Шаноўныя мужчыны СШ № 2!***
***Сардэчна віншуем вас са святам — Днём абаронцаў Айчыны!***
***Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту, бадзёрасці, поспехаў, невычэрпнага запасу жыццёвых сіл, аптымізму і спакою, здзяйснення планаў і пачынанняў, самых смелых праектаў. Няхай ваша жыццё будзе светлым, шчаслівым і поўным ад таго, што ў вас ёсць дом, сям'я і блізкія людзі побач. Няхай вас акружаюць любоў і пяшчота вашых любімых.***

# ШКОЛЬНАЙ СЦЯЖЫНКАЙ ДА ПОСПЕХУ

*Прадстаўнік ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" стаў уладальнікам першага месца па выніках конкурсу «Шукаем таленты» на рашэнне задач па геаметрыі вучнямі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці. Вучань сёмага класа, Макар Шпакоўскі вылучаецца сваёй стараннасцю, неадольнай цягай да ведаў, імкненнем да самаразвіцця. Здаецца, што школьныя прадметы не выклікаюць у хлопца ніякіх цяжкасцей. Ці так гэта на самой справе?*

**- Макар, гэта ж не адзіны конкурс, удзельнікам якога ты быў?**

*- Я імкнуся праявіць сябе ўсюды і ва ўсім. Спрабую свае сілы праз удзел у конкурсах - "Буслік" (з 4 класа), "Кенгуру" (з 3 класа), "Журавлик" (з 5 класа), "Синица" (з 7 класа). Акрамя гэтага, наведваю заняткі школьнага клуба вясёлых і знаходлівых.*

**- Якія ж са школьных прадметаў у раскладзе найбольш вабіць цябе?**

*- Аддаю перавагу матэматыцы, беларускай мове, хіміі.*

**- З дамашнімі заданнямі бацькі дапамагаюць?**

*- Я раблю ўсё сам, але калі ёсць цяжкасці, то часцей іду да таты. Акрамя дамашніх заданняў па біялогіі і беларускай мове, тата прыходзіць на дапамогу і ў рашэнні алімпіядных задач па матэматыцы.*

**- Ці праўда, што твае бацькі – выпускнікі нашай установы адукацыі?**

*- Так, усё правільна. У мяне ёсць удалы прыклад для пераймання: тата скончыў школу з сярэбраным медалём.*

**- А чым яны займаюцца цяпер?**

*- Тата, Аляксандр Валер'евіч, працуе старшым інспектарам Бярэзінскага РАУС, а матуля, Таццяна Уладзіміраўна - галоўны бухгалтар на сыраробным заводзе.*



**- Макар, нягледзячы на штодзённую загружанасць, у цябе ж, напэўна, ёсць і хобі?**

*- Я люблю спорт. Па панядзелках, серадах, чацвяргах, пятніцах займаюся ў секцыях па баскетболе і валейболе.*

**- Якой літаратуры аддаеш перавагу?**

*- Падабаецца чытаць пра вынаходніцтвы і адкрыцці. Энцыклапедыі даюць поўную інфармацыю, якая мяне цікавіць, напрыклад, пра этапы стварэння транспарту. Вабіць сваёй таямнічасцю фантастычная літаратура. Апошняе з прачытанага - раман Уладзіміра Обручава "Зямля Саннікава", у якім ідзе аповед пра экспедыцыю да Паўночнага полюса.*

**(Працяг на стар. 8).**












*Віншуем вас з гэтым цудоўным святам! Жадаем поспеху ва ўсім, будзьце такімі ж вясёлымі і прыгожымі, смелымі і сур'ёзнымі. Дзякуючы вам, мы заўсёды ўпэўненыя ў галоўным: побач знаходзяцца сапраўдныя абаронцы.*

**Дзяўчаты 5 «Б».**



